ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 172 (1139) | ПАНЯДЗЕЛАК, 28-га ліпеня 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 "
6 месяцаў . . . 1 р. 80 "
1 год . . . 3 р. 30 "
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

Выправім памылкі на-хаду

З мейсц сыгналізуюць аб тым, што самаправерка па цэламу шэрагу раённых комсамольскіх організацый не дасягнула сваёй мэты, што перавыбарчую кампанію бюро ячэек ня ўцягнуты шырокія колы комсамольцаў і беспартыйнай працоўнай моладзі, раённыя камітэты не пачулі папярэдніх сыгналаў „Чырвонай Зьмены“ і працягваюць сваё галавацянства, нядбайнасьць і абломаўшчыну ў гэтай важнейшай політычнай кампаніі.

Назначэньне перавыбараў бюро ячэек па ўсяму раёну ў адзін дзень, дача на падрыхтоўку ня больш 3-5 дзён, адсутнасьць растлумачэньня комсамольцам задач самаправеркі, незацікаўленасьць перавыбарчай кампаніі з боку партыйнай організацыі—вось становішча, якое сустракаецца амаль у кожным раёне.

Самаправерка—масавы агляд працы кожнай ячэйкі, кожнага комсамольца паасобку. У час самаправеркі трэба выявіць наш удзел у спаборніцтве, ударніцтве, колгасным руху, культурным будаўніцтве. Трэба праверыць ідэёвую ўстойлівасьць і політычную падкаванасьць організацыі.

Частка організацыі гэтага ня ўмела зрабіць, чым фактычна самаправерку правaліла (Гарадок, Парычы, Камарын і інш.).

Дырэктыва аб разгортваньні вучастай, дзейнай самакрытыкі ня ўсімі выканана. Крытыку і самакрытыку не скарыстоўваюць для бязьлітаснай барацьбы з руцінаю, коснасьцю, прарывамі ў рабоце паасобных організацый. Недастаткова прыцягнуты да самаправеркі юнкоры і насьценныя газэты. Трэба, каб кожны комсамолец зразумеў, што **самакрытыка ня ёсьць самамэта, а сродак для дасягненьня пастаўленай перад намі мэты.**

Барацьба з правым ухілам, як галоўнай небясьпекай, „левым“ опортунізмам і прымірэнцтвам да яго **павінны стаяць у цэнтры ўвагі перавыбарчых сходаў.** Некаторыя раённыя камітэты комсамолу з-за сваёй політычнай блізарукасьці, політычнай няпісьменнасьці, нават яшчэ і гэтага не зразумелі. Выхоўваючы комсамольцаў на конкрэтных жыцьцёвых прыкладах нашага соцыялістычнага будаўніцтва, трэба ў час самаправеркі скласьці грамадзкую думку вакол політычнай вучобы, вывучэньня тэорыі Маркса-Леніна. **Той, хто політычна непадрыхтаваны, ня можа быць актыўным барацьбітом на соцыялістычнай будоўлі, ён ня зможа весьці рашучай барацьбы на два фронты ў шэрагах нашай партыі і комсамолу.** Вызначыць конкрэтны плян політ-вучобы, політ-выхаваньня,—вось задача, якую неабходна вырашыць у час самаправеркі.

Цэлы шэраг ячэек у горадзе не мабілізаваліся на барацьбу за выкананьне промфінплянаў, за замацаваньне і далейшае разгортваньне колгаснага руху ў вёсцы. **Павярнуцца тварам да вытворчасьці, да колгасаў—гэта адзін з галоўнейшых лёзунгаў самаправеркі.**

Перавыбары бюро ячэек у бліжэйшыя часы павінны закончыцца. Там, дзе яны прашлі без папярэдняй падрыхтоўкі, бяз удзелу мас, там, дзе парушана ўнутры-саюзная дэмократыя, дапушчана казённасьць—**перавыбары трэба адмяніць і назначыць новыя, даўшы тэрмін для сталай іх падрыхтоўкі.**

Праводзячы перавыбары, выпраўляючы хібы, на ходу неабходна зараз-жа прыступіць да падрыхтоўкі раённых комсамольскіх конфэрэнцый. Неабходна падумаць, у сувязі з ліквідацыяй акруг, аб разьмеркаваньні акруговых комсамольскіх работнікаў для ўзмацненьня раёнаў з такім разьлікам, каб на райконфэрэнцыях, якія будуць праводзіцца ў жніўні месяцы, яны ўжо былі абраны ў склад новых райкамолаў.

Пад знакам вывучэньня пастаноў 16 зьезду ЎсеКП(б) і 13—КП(б)Б пад знакам іх практычнага ажыцьцяўленьня, павінны прайсьці перавыбары нізавых зьвеньняў саюзу—бюро ячэек, а ўсьлед за імі—раённых камітэтаў.

Ліквідаваць акругі БССР да 1-га кастрычніка

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Комісараў Беларускае ССР

У адпаведнасьці з пастановай ЦВК і СНК Саюзу ССР за 23 ліпеня 1930 г. „Пра ліквідацыю акруг“, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Комісараў БССР **пастанаўляюць:**

1. Правесьці ліквідацыю акруговых выканаўчых камітэтаў і ўсіх акруговых установаў да 1-га кастрычніка 1930 г.

2. Усе правы і абавязкі акруговых выканаўчых камітэтаў перадаць раённым выканаўчым комітэтам, а таксама гарадох Менску, Віцебску, Гомелі, Бабруйску, Магілеве, Воршы, Полацку, Барысаве, Мазыры і Рэчыцы—гарадзкім саветам. Гарадзкія саветы названых гарадоў беспасрэдна падпарадкаваць Цэнтральнаму Выканаўчаму Комітэту і Савету Народных Комісараў БССР.

3. Даручыць акруговым выканаўчым камітэтам не пазьней 15 га жніўня г.г. разьмеркаваць паміж гарадзкімі саветамі і раённымі выканаўчымі комітэтамі ўсе падпарадкаваныя акруговым выканаўчым комітэтам прадпрыемствы, соцыяльна-культурныя ўстановы, матэрыяльныя сродкі і грашовыя абавязацельствы, прычым прадпрыемствы і соцыяльна-культурныя ўстановы на тэрыторыі гарадоў павінны быць перададзены гарадзкім саветам, а астатнія—раённым выканаўчым комітэтам.

4. Для разьмеркаваньня паказаных прадпрыемстваў і матар'яльных сродкаў організаваць спэцыяльныя акруговыя комісіі з 5 асоб на чале з старшынёю АВК з удзелам у патрэбных выпадках у рабоце гэтых камісій старшынь адпаведных РВК і гарсаветаў.

5. Ня менш 90 проц. адказных работнікаў акруг накіраваць на работу ў раёны. Адначасова з гэтым ужыць рашучыя меры да ўзмацненьня кадраў сельскіх саветаў і палепшаньня матэр'яльнага становішча працаўнікоў раёну і сельскіх саветаў.

6. Організацыя раённай сыстэмы паказаных вышэй пачатках павінна быць праведзена такім чынам, каб адміністрацыйныя выдаткі па кіраўніцтве на 30-31 бюджэтны год як па дзяржаўным, так і па мясцовым бюджэце не перавышалі сум, асыгнаваных на ўтрыманьне акруговых і раённых апаратаў у 1929-30 г.

Замацаваць за раённымі выканаўчымі комітэтамі і гарадзкімі саветамі прыбыткі, якія былі прадастаўлены акруговым выканаўчым комітэтам паводле адпаведнага законадаўства.

7. Увесьці з 1-га кастрычніка 1930 году самастойныя сельскія бюджэты ва ўсіх сельскіх саветах і прапанаваць раённым выканаўчым комітэтам перадаць да 1-га кастрычніка г. г. сельскім саветам адпаведныя прадпрыемствы і іншыя крыніцы прыбыткаў.

8. Катэгарычна забараніць усякія зьмены існуючых межаў раёнаў і сельскіх саветаў на пэрыяд ліквідацыі акруг.

9. Прапанаваць усім народным комісарыятам цэнтральным установам і організацыям у 5-цідзённы тэрмін распрацаваць проэкты патрэбных зьмен у структуры і штатах раённых і цэнтральных апаратаў, прадугледзеўшы ў проэктах узмацненьне інструктарскай часткі гэтых апаратаў і проэкты падаць Народнаму Комісарыяту РСІ.

10. Даручыць народным комісарыятам і цэнтральным установам і організацыям безадкладна ўстанавіць беспасрэдную сувязь з раёнамі і горсаветамі. Пераходны пэрыяд да непасрэднай сувязі з раёнамі і гарсаветамі не павінен аслабіць праводзімых гаспадарчых кампаній.

11. Даручыць народным комісарыятам, цэнтральным установам і організацыям у месячны тэрмін распрацаваць і падаць у звычайным парадку ў заканадаўчыя органы проэкты зьмен існуючага законадаўства БССР, якія вынікаюць з гэтай пастановы.

12. Даручыць Савету Народных Комісараў распрацаваць у месячны тэрмін проэкт палажэньня пра раённыя зьезды саветаў, раённыя выканаўчыя комітэты і гарадзкія саветы і ўвесьці на разгляд і зацьверджаньне прэзыдыуму ЦВК БССР.

13. Даручыць упоўнаважанаму Наркомпаштэлю ў 20-цідзённы тэрмін распрацаваць мерапрыемствы па ўзмацненьню паштовай, тэлеграфнай і радыё сувязі з раёнамі і сельсаветамі і ўнесьці ў СНК.

14. Даручыць Дзяржпляну кантрольныя лічбы на 1930-31 г., а наркоматам і цэнтральным установам усе опэрацыйныя пляны пабудаваць у раённым і гарадзкім разрэзе.

Вык аб. старшыні цэнтральнага Выканаўчага Комітэту БССР
А. Хацкевіч.

Нам. старшыні СНК БССР
К. Бэнэк.

За сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Комітэту БССР
А. Сташэўскі.

26-га ліпеня 1930 г.
гор. Менск.

Якім будзе рэорганізуемы апарат

(З проэкту камісіі НК РСІ)

Камісія НК РСІ па ліквідацыі акруг скончыла разгляд проэктаў структуры організацыі апаратаў, штатаў і зарплаты, цэнтральнага, раённага і гарадзкіх саветаў.

Новае, што ўносіцца проэктам НК РСІ,—гэта ліквідацыя існуючых зараз аддзелаў ў савецкіх апаратах і перавод працы апаратаў на функцыянальную сыстэму.

Апорнымі пунктамі організацыі савецкага апарату, як гарадзкога, так і нізавога,—будзе эканамічнае становішча гораду, раёну, сельсавету і шчыльнасьць насельніцтва. Прыняты камісіяй НК РСІ проэкт структуры апарату раёнаў, сельсаветаў і гарсаветаў месьціцца ў наступным:

Саветы падзяляюцца на тры групы па ліку насельніцтва: 1-ая група з насельніцтвам да 1000 чалавек, другая—ад 1000 да 4000, 3-я—звыш чатырох тысяч, у залежнасьці ад гэтага падзелу апарат сельсавету павінен складацца: у першай групе з двух чалавек, у другой з трох і трэці—з чатырох. У сельсаветах другой і трэцяй групай уводзіцца пасада рахункавода-статыста. Бюджэт цалкам пераходзіць сельсаветам, а таксама пераходзяць прадпрыемствы, якія знаходзяцца на тэрыторыі сельсавету. Пры ўтварэньні раённых цэнтраў,—апошнія падзяляюцца таксама на тры групы, а гарадзкія саветы на 4 групы з такім разьлікам.

Раёны: 1-ая група з насельніцтвам да 40.000 чалавек, 2-ая—ад 40 да 75 тысяч чалавек, 3-яя звыш 75 тысяч чалавек. Раёны атрымліваюць шырокія правы плянаваньня гаспадаркі, гэтай галінай працы будуць кіраваць адзін з намесьнікаў старшыні, і ўводзіцца пасада эканоміста-плянавіка.

Нарэшце, замест раней меўшыхся аддзелаў пры РВК зараз уводзяцца інспэктары і даюцца новыя галіны працы, як ліквідацыя няпісьменнасьці, інспэктар—валютна-фінансавай справы, а замест ранейшых начальнікаў адміністрацыйнай часткі ўводзіцца інспэктар па адміністрацыйнай частцы, які адначасова будзе зьяўляцца начальнікам раймiліцыі.

Горсаветы: Першая група з насельніцтвам да 16.000. Другая ад 16 да 40 тысяч, трэцяя ад 40 да 75 і 4-ая—звыш 75 тысяч чалавек. Горсаветы, якія маюць да 16 тысяч (дробных гарадоў) будуць падпарадкаваны Райвыканкомам, а па астатніх групах самастойныя.

Горсаветам буйных гарадоў Гомель, Віцебск, Менск, Бабруйск і Магілёў даюцца дзьве пасады намесьнікам старшынь, адзін з якіх будзе кіраваць плянава-экономічнай справай, а другі комунальна-бытавым. (У гарадох менш 40.000 чалавек пасада намесьніка ня ўводзіцца) Па буйных горсаветах уводзіцца яшчэ пасада інспэктара па нац. пытаньнях, архітэктар і эконеміст плянавік.

Аб рэорганізацыі цэнтральнага апарату будзе разгляд асобна.

К.

Міжнародны зьлёт юных піонэраў

...„Мы клянемся ўсе сілы аддаць на абарону СССР!“

„Мы шлем гарачае прывітаньне усім членам Савецкай дэлегацыі, а разам з імі усім пролетарам і пролетарскім дзецям Савецкага Саюзу“

„Разам з вамі мы выказваем сваё абурэньне супроць здрадніцкай політыкі нікчэмных цэргібеляў, якія пабаяліся праўды аб СССР“

Міжнародны зьлёт піонэраў

БЭРЛІН, 25. Міжнародны конгрэс юных піонэраў адначыў свае работы і працягваў абгаварэньне розных пытаньняў.

Юныя піонэры ва ўзросьце ад 6 да 14 год, якія прыбылі з Нямеччыны, Бэльгіі, Польшчы, Даніі, Швэцыі, Норвэгіі, Швэйцарыі, Аўстрыі і Амэрыкі простымі дзіцячымі словамі расказваюць аб жыцьці дзяцей, аб эксплёатацыі і прыгнечаньні.

Чэшскія піонэры выканалі пясенькі, у якіх высьмейвалі поліцэйскіх. Пасьля гэтага оркестр балалаечнікаў выканаў рускія песьні. Нечакана ў залю паседжаньня ўвайшла дэлегацыя ангельскіх піонэраў у складзе 6 чалавек. Гэтая дэлегацыя прыбыла ня гледзячы на поліцэйскія перасьледваньні і ўсе магчымыя цяжкасьці пры пераезьдзе мяжы. Дэлегацыя пры бурных апладысмэнтах перадала прысутнічаўшым сваё піонэрскае прывітаньне і выканала ў гонар ангельскіх піонэраў рэволюцыйны Інтэрнацыянал.

Страшэнны гальштук

Наперакор стараньням соцыял-фашыстаў міжнародны зьлёт піонэраў у Бэрліне адкрыўся і паслаў палкае прывітаньне піонэрам СССР, прадстаўнікі якіх ня былі дапушчаны на зьлёт. (З газэт)



Сон соцыял-Цэргібэля ў час міжнароднага піонэрскага зьлёту.

25 тысяч на мітынгу

БЭРЛІН, 25.—Штаб другога сусьветнага зьлёту юных піонэраў паведамляе, што на ўчарашніх мітынгах, якімі адчыніўся зьлёт, удзельнічала 25 тысяч рабочых і дзяцей рабочых.

Да 3 часоў ночы рабочыя і работніцы чакалі каля штабу зьлёту новых дэлегатаў для таго, каб узяць іх да сябе на кватэры.

Тры баявых рапарты

БЭРЛІН. 25. Сусьветны зьлёт юных піонэраў паслаў аднагалосна прынятую прывітальную тэлеграму ЦБ юных піонэраў СССР, Комінтэрну КІМ'у, ЦК УсеКП(б) і ЦК УсеЛКСМ.

Прывітаньне ЦБ юных піонэраў СССР, членам савецкай дэлегацыі на зьлёт усім піонэрам СССР гавораць.

— „Цэргібэлі забаранілі прыезд савецкай дэлегацыі на зьлёт,—яны баяцца лішні раз пачуць праўду пра СССР.

Цэргібэлі ўсяляк стараліся сарваць наш зьлёт, але гэта ім не ўдалося. Перамогшы ўсе цэргібэлеўскія перашкоды, мы сабраліся сёньня з усіх канцоў сьвету на свой другі міжнародны зьлёт. Наша першае слова да вас—да 4 мільённай арміі юных піонэраў Савецкага Саюзу. Разам з вамі, мы выказваем свае абурэньне супроць здрадніцкай політыкі нікчэмных Цэргібэляў, якія пабаяліся праўды аб СССР.

Мы шлем гарачае прывітаньне ўсім членам савецкай дэлегацыі, а разам з імі і ўсім пролетарскім дзецям Савецкага Саюзу.

СССР наша бацькаўшчына. Мы клянемся ўсю сваю сілу аддаць на абарону СССР і разьнесьці праўду аб Савецкім Союзе ва ўсе канцы зямное кулі.

Мы клянемся працаваць так, як працуеце вы піонэры краіны Саветаў. Мы клянемся дапамагаць нашым братом у іхняй рэволюцыйнай барацьбе так, як вы дапамагаеце вашым бацьком і братом у соцыялістычнай будоўлі і выкананьні пяцігодкі.

Ганьба соцыял-здраднікам! Няхай жывуць юныя піонэры і ўсе пролетарскія дзеці СССР! Няхай жывуць УсеКП(б) і УсеЛКСМ! Няхай жыве Комінтэрн!“

Тэлеграма ЦК УсеКП(б), таварышу Сталіну кажа:

— „Другі міжнародны конгрэс пролетарскіх дзяцей шле гарачае прывітаньне УсеКП(б) ў яе асобе ўсяму пролетарыяту СССР. Мы з радасьцю адзначаем вялізарныя посьпехі соцыялістычнага будаўніцтва ў СССР, у той момант, калі ў капіталістычных краінах з кожным днём пагаршаецца становішча нашых бацькоў-рабочых. Няхай жыве Усе КП(б) і яе ЦК! Няхай жыве т. в. Сталін—лепшы вучань Леніна, правадыр Усе КП(б) і Комінтэрну.

У тэлеграме Комінтэрну і КІМ'у зазначаецца, што:

„Прадстаўнікі дзяцей працоўных усяго сьвету сабраліся на зьлёт, каб лішні раз продэманстраваць сваю клясавую нянавісьць да сусьветнай буржуазіі, яе верным лакеям—соцыял-дэмократычным здраднікам, і сваю аддачасьць і салідарнасьць з рэволюцыйнай барацьбой рабочае клясы. Мы ведаем, што пролетарскі дзіцячы рух можа разьвівацца толькі пад сьцягам Комінтэрну і КІМ'у. Няхай жыве Комінтэрн—штаб сусьветнай рэволюцыі, адзіны абаронца інтарэсаў рабочых! Няхай жыве КІМ!“

У тэлеграме ЦК УсеЛКСМ зьлёт шле гарачае піонэрскае вітаньне:

— „Кіраўніку чатырохмільённай арміі савецкіх юных піонэраў, перадавому атраду КІМ—ЦК УсеЛКСМ“.

Ліст з Віцебску

завод „Чырвоны Мэтал...

ПРАКУРАТУРА І АКРУГКОМ МАЎЧАЦЬ—ЗЬДЗЕКІ ПРАЦЯГВАЮЦ...

2 месяцы пракуратура і акругком ЛКСМБ адцягваюць расьсьледваньне фактаў ганеньня і нечалавечай траўлі групы былых бяспр... тульных, Друяна Цімчанка і іншых—„Віцебскі пралетары" аб гэтым пісаць не асьмельваецца

Пракуратура і АКК павінна сказаць апошняе слова!

„Гэроі" зьдзекаў над людзьмі павінны быць пакараны

У № 135 „Чырвонай Зьмены" ад 13-га чэрвеня г. г. мы зьмяшчалі ліст былых бяспрытульных Друяна і Цімчанка, у якім яны расказвалі аб нячуваных зьдзеках над імі на заводзе «Чырвоны Мэталіст» у Віцебску.

Зьдзек і нечалавечыя адносіны з боку некаторых кіраўнікоў заводу, партколектыву, профарганізацыі і заводзкага колектыву ЛКСМБ давялі некаторых з іх да самагубства, некаторых штурхнулі ізноў у абдымкі вуліцы, некаторыя... трапілі у Салаўкі.

У сваей прыпісцы „Чырвоная Зьмена" рашуча асуджала паступкі тых, якія ўздумалі шукаць выхаду са складўшагася становішча—у самагубстве. Мы лічылі і лічым зараз, што іх паступак падлягае асудженьню усёй грамадзкасьці. Разам з тым мы патрабавалі ад адпаведных органаў безадкладнага расьсьледваньня справы і прыцягненьня да судовай адказнасьці вінаватых у траўлі бяспрытульных.

Гэта было 13-га чэрвеня.

29-га чэрвеня мы атрымалі паведамленьне Віцебскага гарадзкога пракурора аб тым, што па лісту пачалося сьледзтва і што яно вядзецца пад наглядам пракурора. Праз некаторы час, менавіта, 7-га ліпеня рэдакцыя атрымала другі ліст ад т. т. Друяна і Цімчанка ў якім яны паказалі на тое, што расьсьледваньне іх справы ідзе марудна, больш таго, што гэтаму перашкаджаюць некаторыя работнікі Акругкому—былыя кіраўнікі колектыву заводу „Чырвоны Мэталіст", у той час, калі адбываліся над імі гэтыя зьдзекі. У той-жа дзень матар'ялы быў у другі раз накіраван Віцебскаму пракурору. Чакалі адказу, а яго ня было як і няма у рэдакцыі па сёньняшні дзень.

Так прасоўвалася справа з расьсьледваньнем у органах пракуратуры. Комсамольскае-ж кіраўніцтва Віцебску: Акругком, другі райком ЛКСМБ і колектыў заводу, дзе адбываліся падзеі, да гэтага часу нічога не зрабілі, каб паскорыць расьследваньне справы. (Да-рэчы скажам, што аб лісьце мы асабіста гаварылі з сакратаром АК тав. Гуткіным і членам бюро Віцебскага АК тав. Сімуніным).

Сёньня, праз паўтара месяцы мы атрымалі паведамленьне (не ад Віцебскай пракуратуры і комсамольскіх організацый) ад аднаго члена парткамісіі, які ўдзельнічаў у расьледваньні лісту аб тым, што факты паказаныя у лісьце б. бяспрытульных, амаль поўнасьцю пацьвярджаюцца. Майстар Дамброў і дырэктар заводу Мураўскі—вось галоўныя дзейныя асобы гэтага зьдзеку. Калі нядзейнымі асоббамі, дык спачуваючымі ім, былі кіраўнікі заводзкага парт. колектыву, комсамольскага завкому. Адпаведныя партыйныя організацыі павінны заняцца устанаўленьнем іх віноўнасьці і прыцягнуць да партыйнай адказнасьці.

І яшчэ што зьдзіўляе нас і выклікае абурэньне, гэта паводзіны акруговай газэты «Віцебскі Пролетары», які зараз пасьля расьследваньня справы партыйнай камісіяй адмовіўся друкаваць матар'ял аб нечалавечых адносінах і зьдзеках над групай былых бяспрытульных на заводзе „Чырвоны Мэталіст".

Мы за бальшавіцкае выкрыцьцё нечалавечых адносін да людзей, і калі „Віцебскі Пролетары" ня лічыць патрэбным гэтым займацца, дык тым горш для яго.

Мы патрабуем ад віцебскай прокуратуры паскорыць тэмпы расьследваньня справы і прыцягненьня вінаватых да судовай адказнасьці.

Ад Віцебскай АКК РСІ мы патрабуем прыцягнуць да партыйнай адказнасьці людзей з бюро партыйнага колектыву, комсамольскага і завкому заводу, на вачох якіх утвараліся зьдзекі над бяспрытульнымі.

Слова за АКК.

ночы, у той час калі кантрольная табельная дошка для вешаньня марак была зачынена. І 9 дзён, што Друян прапрацаваў на начной зьмене з-за немагчымасьці вешаць марку, залічваюць прагулам. Друян стаў „злосным прагульшчыкам". Друяна занесьлі на чорную дошку.

Абганьбаваны і зморany голадам Друян абівае парогі прадстаўнікоў цэхкамітэту Шэвялёва і Кэрча, але дарэмна. Яны ня жадаюць заступіцца за яго. Яго заява засталася ляжаць ў заўкомаўцаў без руху, амаль 2 м-цы.

Пачалася адпускная кампанія. Друяну, як і усім недасягнуўшым 18 год, далі месячны адпачынак. Прышоўшы з адпачынку, ізноў, Друян даведаўся аб тым, нібы ён за час адпачынку зрабіў „незаконны прагул", бо яму па словах дырэктара Мураўскага належыў толькі 2-хтыднёвы адпачынак. Ізноў пайшлі прыдзіркі, лаянка, пагрозы, зьдзеньнены, і нарэшце, перавялі на масавую некваліфікаваную работу.

Члены камісіі, якія рабілі расьследваньне лісту бяспрытульных зьмешчанага „Чырвонай Зьменай", так-сама былі сьведкамі агідных і нечалавечых адносін да бяспрытульных з боку заводзкіх організацый.

Адпрацаваўшы 6 гадзін без сьнедаданьня, Цімчанка і Друян зьвярнуліся да нас з просьбай пазычыць 4 капейкі на хлеб. На просьбу члена т. камісіі т. Б. аказань

вучням грашовае падтрыманьне ... шыня заўкому Аўрускін і сак... партколектыву Станкевіч—адка...

У нас не Сабез. Калі ты добры, дык вазьмі з сваё... шэні і дай ім". Камэнтары... патрэбны...

Друяна прымусілі лезь... пятлю

Друяна прымусілі лезьці у ... ад чаго на яго шыі зусім ня ... ся глыбокі шрам, але гэта не з... ніякага уплыву на цьверда... чыноўнікаў з верхавіны пар... профсаюзнай і комсамольскай ... ганізацыі „Чырвонага мэтал...

Мэтпромаўскія ворокі не на... прайсьці міма усей нашай ... тарскай грамадзкасьці. Вых... з бяспрытульных злачынцаў ... цыдывістаў замест кваліфіка... рабочых мы нікому не дазво...

Інструктар **Дамброў і ды... Мураўскі** маюць вялікі стаж ... ваньня і грубых адносін да бя... тульных. Трэба самым су... чынам пакараць за такія ... РСІ і пракуратура, спра... Вамі. **Г. Каг...**

Перад адпраўленьнем у ... гэтай карэспондэнцыі мы атр... паведамленьне аб тым, што: ... сарэнка за зробленую ім кішэ... пакражу сядзіць у напраўчым ... і Цімчанка ужо некалькі дзё... ня вышаў на працу. Такім ... з 7-мі бяспрытульных пас... шых на завод застаўся толькі Друян.

Выратаваць ахвяры бяздушша

Цяжка і дрэнна жылося бяспрытульным хлопчыкам: **Друяна, Цімчанку Слесарэнка, Галькову і Дуброўскаму.**

Заўсёды галодныя, разутыя і абарваныя, галеючы па 5-6 сутак—яны праводзілі сваё жыцьцё ў катлах, на вакзале, у хлявох, і ў прыбіральных, разам са зладзеямі.

„Счасьлівы выпадак"

Аднойчы... Іх беспрасьветнае і цяжкае жыцьцё выштурхнуў з звычайнай калеі.—„**Счасьлівы выпадак.** На іх зьвярнулі ўвагу і паслалі на вучобу на завод „Чырвоны Мэталіст". Хлопчыкі былі ў вялікім захапленьні. „**Бывай жыцьцё бяспрытульніка, бывайце мукі, зладзейства, бруд, вошы, холад і голад.** Мы будзем новымі і сумленнымі працаўнікамі". Весела і радасна было на сэрцах бяспрытульных у гэты незвычайна сьчасьлівы для іх дзень. Прышлі яны у цэх на працу. Іх залічылі ў вучнёўскую брыгаду.

Але ня доўга працягалася гэтае шчасьце. Інструктар мэханічнага цэху—**Уладзіміровіч** ня любіў і не цярпеў бяспрытульных. „**Пачуцьцё панскай вартасьці**" забараняла яму паважаць нейкую „шантрапу".

...„Ізноў маршрут на вакзал"...

Пачаліся прыдзіркі... Друян становіцца першай афярай. Яго перакідваюць на завод „Комінтэрн"—чорнарабочым. Чорная цяжкая праца не па сіле для хворага Друяна. На ўсе яго скаргі ніхто не зьвяртаў увагі. Усьлед за гэтым пачаліся незвычайныя вылікі з іх малога зароблку. **Часам вылічвалі да капейкі, а затым спынілі апалы кватэры, у якой знаходзіліся бяспрытульныя.** Па колумове бяспрытульным апальвадь кватэру павінна была заводакіраўніцтва.

Ізноў наступілі халады... Дзе начаваць? Успомнілася старое... Ізноў пайшлі бяспрытульныя на вакзал. Больш слабыя ня вытрымалі. Галькоў пачаў нанава займацца крадзежамі, стаў рэцыдывістым і папаў у Салаўкі. Дуброўскі ўцёк з заводу.


Што рабіць... Напісалі ліст тав. **Сталіну** аб сваіх мытарствах. Аб гэтым даведаліся на заводзе. Адносіцца да іх пачалі лепей. Друяна перавялі зноў на завод. Але гэта было нядоўга. Праз некаторы час **Слесарэнка** пераводзіцца ў плужны цэх. Праца для яго аказваецца **непасільнай**, зьвярнуўся ў заўком, за дапамогай але апошні адказаў маўчаньнем. Пачаліся ізноў, ды яшчэ большыя вылікі з зарплаты, вылічвалі да капейкі. **Голад пачаў ўступаць ў свае ранейшыя правы.**

Цяпер у мяне будзе новая кашуля і абутак!

Інструктар Уладзіміровіч за бюрократызм быў зьняты з працы і звольнен з заводу. Новы стаў т. Дамброў. Думалі ён дапаможа. Падалі заяву, у якой прасілі часова перавесьці на зьдзельную аплату. Задаволілі. У першы-ж месяц **Друян** зарабіў 74 рублі. Надышоў час палучкі ізноў **вылічылі да капейкі.** Думаў, у наступным месяцы будзе лепей. І сапраўды ў наступны месяц Друян зарабіў каля 100 рублёў. Абрадаваўся... Цяпер у яго будзе новая кашуля, боты і абутак. Але радасьць зьмянілася новым пінком, новым зьдзекам. **Дамброву не па смаку прышлося тое, што бяспрытульны зарабіў столькі грошай, і ён парваў нарад, выдадзены прыёмшчыкам Друяну за заробленую работу, выплаціўшы яму замест 100 па вучнейскай сетцы 17 рублёў і плюс 50 проц. нагрузкі.**

Друян „прагульшчык"

Акрамя гэтага Друяна майстар Дамброў прымушаў прыхадзіць на працу з 6 гадзін увечары да 12



З-за носа ня бачаць жывых людзей

Падрыхтоўка да прызыву 19...

У Глуску пачалі добра

13-га ліпеня ў м. Глуску адбылася раённая конфэрэнцыя дапрызыўнікаў 1908 года нараджэньня. Дажджлівая пагода, гразішча, далёкая аддлегласьць населенных пунктаў ад раённых цэнтраў, але гэта не пашкодзіла дапрызыўнікам своечасова сабрацца. Стройнымі радамі організавана, з песьнямі і чырвонымі сьцягамі ўперавае крочылі дапрызыўнікі на конфэрэнцыю. Нардом перапоўнен людзьмі, ажыўленыя гутаркі аб прадстаячым прызыве.

— Нік не магу дачакацца часу, каб усгуаіць у шэрагі Чырвонай арміі—гаворыць адзін дапрызыўнік.

— Я усе-роўно адкажуся ад льготы.—заяўляе другі прызыўнік.

Іхнія думкі падтрымліваюць іншыя таварышы.

У фойе штурхатня—гэта прызыўнікі атрымоўваюць літаратуру...

Нарэшце, конфэрэнцыя аб'яўляецца адчыненай. З дакладам аб унутраным становішчы СССР выступае сакратар РК КПБ(б). Дапрызыўнікі ўважліва слухаюць даклад і ў сваёй рэзолюцыі адобраюць політыку партыі і савецкай улады, якая накіравана на мірнае будаўніцтва ...шай ...цыялістычнай гаспадаркі ...глядзячы на ...адзі ...бок ...ка імперыялістычных краін, якія жадаюць справакаваць СССР на вайну.

— Па-першаму заклiку партыі будзем магутна даць адпор усім тым, хто будзе спрабаваць перашкодзіць нам у мірным будаўніцтве!

— Дапрызыўнікі абвясьцілі сябе ўдарнік ... п... ... ... ю ... ... чы ... й к ... ...

— Уд... ... ...тычнай гас... падаркі ўступім у шэрагі Чырвонай Арміі!

— Права абароны рэспублікі з аружжам у руках належыць працоўным масам, не дапусьцім у шэрагі РСЧА праяўленьня класава-варожым элемэнт.

Зачытваецца сьпіс дапрызыўнікоў праверкі яго прыгоднасьці ў ... ную армію. Зірка сачыць за ... дапрызыўнікі.

— Ён сын кулака... Гэта спэкулянт... Ён пазбаўлен п... а... су... Зірка сачаць каб не пр... Чырвоную армію той каму ня ... у ёй. Прадстаўнік райвоенкам... пісваюць адносіны для расьледва...

Прызыўнікі з увагай высл... юць пытаньне аб прадстаў... льгот.

— Я ад льгот адмаўляюся.— ... батрак—комунар, тав. Пінчук.

Яго заяву падтрымліваюць т... ішчы—льготнік 2-га разраду ... шэўскі, Патапенка, Этус, Мас... Званковіч і інш. таварышы.

—Мы жадаем быць у шэрагах ... ай арміі, якая падрыхтоўвае ... кі байцоў, але і людзей патрэб... цыялістычнаму будаўніцтву!

Іхнія заявы сустракаюцца ... нем і апладысмэнтамі з боку ... нікоў.

Трэба адзначыць, што конф... яшчэ ніколі не пазыходзіла та... нізавана, як у гэтым годзе. Не ... адзін селянін старычок назіраў ... дапрызыўнікі бадзёра крочаць ... вамі на конфэрэнцыю заявіл... царскую армію бралі, дык ... п'янствавалі, дралі, грамілі. Ідуць са сьцягамі і сьпевамі.

Так, ідуць добраахвотна, ... сьпевамі, адмаўляюцца ад льгот ... што ведаюць—Чырвоная ар... таўнік будоўлі соцыялізму!

Комсамольскія ячэйкі, Упаўнаважаныя „Чырв. Зьме...

Паклапаціцеся аб своечасовым забясьпечаньні комсамольцаў „ЧЫРВОНАЙ ЗЬМЕНАЙ" ДА X-га ЗЬЕЗДУ комсамолу Беларусі

Не падмяняць самадзейнасьці мас—казёншчынай

Кіраўнікі Парыцкага, Камарынскага і Гарадоцкага рай омаў ЛКСМБ зрываюць самаправерку і правядзеньне перавыбараў бюро

Перавыбары бюро ячэек, а ўсьлед за імі раённыя комсамольскія конфэрэнцыі—павінны прайсьці пад лёзунгам выкананьня дырэктыў XVI зьезду ЎсеКП(б) і XIII зьезду КП(б)Б

У адзін тыдзень, бяз масавасьці правялі перавыбары

Справаздачна-перавыбарчая кампанія па Парыцкай комсамольскай арганізацыі была аказёнена. Вакол самаправеркі райком комсамолу не надарыў грамадзкай думкі і масавасьці. Райком КП(б)Б таксама не дапамог арганізацыі, арганізаваць масавасьці самаправерку і перавыбарчую кампанію. Тэрмін для справаздачна-перавыбарчай кампаніі быў вызначан з 2 па 7 ліпеня.

Ва ўборачнай кампаніі комсамольская арганізацыя яшчэ не заняла адпаведнага месца.

Зімою Парыцкая организацыя дапусьціла цэлы шэраг грубых палітычных памылак і перагібаў. Але партыйная арганізацыя зусім не зацікавілася праверыць, як комсамол выпраўляе гэтыя перагібы, не даў належнага напрамку. Наглядаецца адваротнае. Казлоўская ячэйка КСМ дапусьціла шэраг памылак пры колектывізацыі; пасьля чаго, убачыўшы вялікі адліў з колгасаў, кінулася ў паніку і апусьціла рукі. Партыйная арганізацыя м. Парычы зусім не зацікавілася гэтым, не дала патрэбнага напрамку гэтай ячэйцы. Партыйныя ячэйкі не прыцягвалі комсамольцаў да сумеснай прапрацоўкі артыкулаў Сталіна, тав. Якаўлева і г. д.

Не была зьвернута палежная ўвага на завастрэньне пытаньня аб дэзэртырства комсамольцаў з фронту колектывізацыі.

Гарэлік, будучы сакратаром ячэйкі комуны імя Сталіна, падрываў працу, сабаціраваў і ў самы адказны момант, у час падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі, уцёк ад цяжкасьцяй, заставіўшы ячэйку бяз кіраўніцтва.

Ячэйка ацаніла гэты паступак, як дэзэртырства, выключыла Гарэліка з шэрагаў комсамолу. У адказ на дэзэртырства комсамольцы наладзілі суботнік па пабудове сілоснай ямы. Райком комсамолу пастанову ячэйкі яшчэ не зацьвердзіў. Ён не завастрае ўвагі ўсёй комсамольскай арганізацыі на прыкладах дэзэртырства ад цяжкасьцяй з боку паасобных комсамольцаў.

Для намесьніка сакратара РК КП(б)Б т Кароткага комсамольскія пытаньні не зьяўляюцца пытаньнямі асабліва важнымі. Калі запытаешся ў Кароткага—„Чаму ты пакінуў комсамольскае пытаньне апошнім, „ён адказвае:—У мяне ёсьць больш сур'ёзныя справы". Тав. Катроткі зьяўляецца прадстаўнікам бюро РК КП(б)Б у райком комсамолу, але-ж зьяўляецца ён туды толькі для гасаваньня. 14 ліпеня на бюро РК КСМ трэба было даць вымову аднаму сябру бюро. Паклікалі т. Кароткага, ён аддаў свой голас за вымову... і пайшоў.



Дэзэртыр колектывізацыі—Гарэлік

— Вядомая рэч, што ў такіх выпадках ня трэба дзівіцца, калі праца комсамолу Парыцкага раёну знаходзіцца ў заняпадзе, што яна зусім выпала з-пад увагі партыйнай арганізацыі.

Партыйны асяродак ня мае ніякай адказнасьці за працу ў комсамоле. На чале арганізацыі стаіць малады комсамолец, нават не кандыдат КП(б)Б, які вельмі часта не разумее правільна лінію партыі, асабліва ў пытаньнях партыйнага кіраўніцтва комсамолам.

На падраёным сходзе КСМ са справаздачай аб працы бюро райкому выступае комсамолец—не сябр бюро і нават не сябр райкому КСМ. У гэты самы час сябр бюро КСМ т. Врублеўскі не зьяўляецца нават на сходы.

Трэба зараз-жа прыняць адпаведныя захады і вывесьці Парыцкую раённую організацыю КСМ з пагражаючага становішча.

В. Шандаровіч.

Пры разгорнутай самакрытыцы

Падрыхтоўчая работа да перавыбараў бюро комсамолу ў эскадроне сувязі 7-ай Самарскай—праведзена добра. Своечасова былі складзены тэзісы справаздачнага дакладу, былі вывешаны спэцыяльныя лёзунгі, перавыбарчая кампанія асьвятлялася ў эскадроннай насьценгазэце.

Перавыбарчы сходператварыўся ў актыўную крытыку і самакрытыку сваіх недахопаў, тут ускрылі ўсе хібы сваёй работы. На перавыбарчым сходзе выступіла ў спрачках 36 комсамольцаў. Політапарат і парт. організацыя дапамагла забясьпечыць 100 проц. яўку таварышоў на перавыбары.

Спрэчкі насілі здаровы характар. Пад абстрэл самакрытыкі былі ўзяты пытаньні ідэолёгічнага становішча комсамолу, пытаньне падняцьця баявой падрыхтоўкі, работы прэзыдыуму і г. д.

У часе сходу выпускаўся „Крокодил". „Крокодил" выклікаў вялікую зацікаўленасьць з боку ўсіх прысутных.

Самі перавыбары прайшлі таксама добра.

Г. Шыфрын.

Ага,.. крытыкаваць мяне!

У час перавыбараў бюро Лапіцкай ячэйкі КСМ, Прапойскага раёну (Магілеўшчына) была выпушчана насьценная газэта „Чырвоны Перадавік", дзе зьмясьцілі допісы пра былога сакратара ячэйкі Саладухіна З. П.

Саладухін, як сябар партыі павінен быў адказваць за сваю работу перад партыйнай ячэйкай і перад масай комсамольцаў, але Саладухін гэтай адказнасьці не адчуваў. Саладухін агідна адносіўся да комсамольцаў, Саладухін правалі работу комсамольскай ячэйкі.



Убачыўшы крытычны допіс у насьценгазэце Саладухін закрычаў:—„Ага... Крытыкаваць мяне" і як зьвер накінўўся на газэту і падраў яе.

Саладухіну ня месца ў шэрагах КП(б)Б.

Аса.

Як у Гарадку угробілі самаправерку

Гарадоцкі РК ЛКСМБ (Віцебшчына зусім не разумее дырэктыў аб самаправерцы. Ён лічыць, што самаправерка,—гэта звычайны агляд працы, а таму няма чаго да яе рыхтавацца.

Быўшы сакратар ЛКСМБ тав. Гаруновіч лічыць, што самаправерку можна адмежаваць ад перавыбараў бюро. У складзеным пляне аб перавыбарах бюро ячэек ні слова ня сказана аб самаправерцы. Толькі ў апошнім пункце, адзначана так: **„Для падрыхтоўкі правядзеньня перавыбараў бюро ячэяк абраць камісіі для абсьледаваньня працы ячэек, якія павінны распачаць працу за 2-3 дні да перавыбараў".**

Неразуменьне політычнай важнасьці самаправеркі з боку РК ЛКСМБ, ячэйковага актыву і усёй комсамольскай організацыі,—тлумачыцца тым, што не прапрацаваны належным чынам дырэктывы аб самаправерцы.

Члены РК ня ведаюць аб пастанове ЦК ЛКСМБ зьмешчанай у „Чырвонай Зьмене" ад 12-УІ-30 г. за № 134. Ня ведаюць аб пастанове ЦК УсеЛКСМ аб становішчы беларускай організацыі.

З боку РК ЛКСМБ нічога ня зроблена ў справе падрыхтоўкі да самаправеркі, калі ня лічыць нарады сакратароў ячэек. Не мобілізаваны ў час самаправеркі комсамольскія масы і моладзь вакол пытаньня, як комсамольская організацыя падышла да выкананьня дырэктыў партыі ў рэконструкцыйны пэрыяд прамысловасьці і сельскай гаспадаркі.

Па пытаньню самаправеркі не праведзена праца сярод юнкораў. РК ЛКСМБ ня склаў інструктарскіх брыгад для дапамогі вясковым ячэйкам у самаправерцы. Некаторыя члены РК інструктар РК Іваноў, АПО РК—Мысарскі і піонэр-работнік Пліскіна склалі сьпіс, каго па іх думцы трэба правесьці ў склад бюро Коопэрацыйнай ячэйкі,—гэтым самым злосна парушылі унутры-саюзную дэмократыю.

Брыгадзір „Чырвонай Зьмены" Лук'яновіч.

Райком ёсьць і людзі ёсьць—няма работы

Кіраўніцтва Камарына ня стала на чале мас

ДАЛЁКІ, ЦІХ, ЗАБЫТЫ АКРУГАЙ...

Камарынскі раён самы далёкі раён Гомельшчыны. Далёкі, ціхі, акругай забыты Камарын.

Комсамолія таксама забыта. Нават раённую конфэрэнцыю Акругкомол ня лічыць патрэбным дасылаць свайго прадстаўніка. Зразумела, што пры слабай дапамозе, пры выключна кепскім кіраўніцтве комсамолія Камарына ў сучасны момант яшчэ зьяўляецца ўдалёным атрадам у барацьбе за соцыялістычную перабудову сельскай гаспадаркі.

Уборачная кампанія па раёну ў самым разгары. Комсамол да ўборачнай падрыхтаваўся, ня стаў застрэльшчыкам ударніцтва, не падумаў аб організацыі соцыялістычнага спаборніцтва. Наглядаецца адваротнае, што сваёй працай комсамольцы компрамэтуюць організацыю.

Вось толькі паасобныя прыклады.

Камарынская местачковая ячэйка пайшла дапамагаць колгасу па ўборцы сена. Як-жа яны дапамагаюць?

Адзін пайшоў на пляж загараць. Дзяўчаты, баючыся праменьняў сонца, каб не спаліць свой твар, так завязаліся хусткамі, што нічога ня бачылі перад вачыма. Трэці ходзіць па лугу і спявае кулацкую песеньку: „У колгасе добра жыць, адзін працуе,—дзесяць сьпіць". У вёсцы Галкі знайшлися такія комсамольцы, якія замест актыўнага ўдзелу ва ўборачнай кампаніі заняліся п'янствам. Нядбайныя адносіны нагляздаем у Піркаўскай ячэйцы. Зусім сьпяць Лукаедаўскія комсамольцы... і г. д.

Бюро райкому КСМ, штодзённай працай сваёй організацыі ня кіруе, ды практычна кіраваць няма каму. Сакратар райкому КСМ тав. Лязоўскі увесь час скарыстоўваецца Райкомпартам на розныя кампаніі, а астатнія сябры бюро, асабліва Капусьцін і Загальскі, зусім нічога ня робяць і рабіць на хочуць. Такім чынам комсамольская організацыя застаецца бяз кіраўнічага органу.

За работай 16 зьезду УсеКП(б) комсамольцы не сачылі. Папярэдняя прапрацоўка тэзісаў адсутнічала. Часта комсамольцы ўлятуюць ў хвасьце сялянскіх настрояў, не растлумачваюць ім цяжкасьці нашага росту. Сакратар РК КСМ у сваем дакладзе гаворыць:—„Праваўхілісцкіх перагібаў у нас ня было". Політычная няпісьменнасьць кіраўнікоў яшчэ больш усугубляе правую небясьпеку ў шэрагах комсамолу Камарына.

З ХУТКАСЬЦЮ МАЛАНКІ...

Тэрмін перавыбарчай кампаніі бюро ячэек Акругкомолам быў намечан з 15-га чэрвеня па 15-е ліпеня. Дырэктыву райком атрымаў 20-га чэрвеня. У канцы месяца яны былі дасланы ячэйкам, а перавыбары бюро назначаны на 13 ліпеня. За адзін дзень рашылі пераабраць бюро ўсіх ячэек. Зразумела, што перавыбары за такі кароткі тэрмін, ды яшчэ ў самы разгар уборачнай кампаніі, прашлі бяз шырокага ўдзелу ўсіх комсамольцаў і беспартыйнай працоўнай моладзі. Самаправерка нічога не дала, бо брыгады вылучаныя па праверцы бюро ячэек не працавалі. Частка віны тут падае ня толькі на райком, але і на акругком, які ня ўлічыў умоў Камарыншчыны, дзе ўборачная кампанія пачынаецца на два тыдні раней, чым у паўночных раёнах.

НЕ ЯЧЭЙКА, А ЦЁПЛАЯ СЯМЕЙКА

Крытыка і самакрытыка сярод комсамольскай організацыі не разгорнута. Пад носам (у спажывецкай коопэрацыі райколгассаюзу, па цэламу шэрагу колгасаў) н глядзецца шэраг бясчынстваў — комсамольцы на гэта не рэагуюць. Местачковая ячэйка зьяўляецца тыпічным „балотам", дзе існуе сямейнасьць, кругавая парука, агульная абарона ад „атак" райкому КСМ. Калі райком пачынае біць па недахопах ячэйкі, дык яны зараз-жа пачынаюць абвінавачаць сакратара РК у антысэмітызьме. Сакратар ячэйкі, які мае 15 нагрузак (падлічана — роўна 15!) ня можа організаваць комсамольцаў і з імі неабходную дысцыпліну сярод комсамольцаў. Дасылаюць аднаго таварыша правесьці фізкультурныя заняткі з піонэрамі. Ён адмаўляецца; —„Мы паставім аб табе пытаньне". „Я сам магу здаць свой білет". „Ну, што мы можам з ім рабіць?"—пытаецца сакратар.

Юнкораўскі рух па раёну зусім не разгорнуты.

Ніхто ня піша, і пісаць ня хоча, бо не разумее задач нашага друку, як самай лепшай зброі ў справе разгортваньня самакрытыкі. За ўсё сваё існаваньне местачковая комсамольская ячэйка выпусьціла два з паловай нумары насьценнай газэты, а па раёну іх існуе толькі 6.

Беларусізацыя тут не ў пашане. Вясковыя комсамольцы добра ведаюць альбо беларускую, альбо ўкраінскую мову (маецца 4 украінскіх нацыянальных сельсаветаў), а местачковая ячэйка працуе выключна на расейскай мове. З тых, хто на белмове выступае, сьмяюцца. У Камарыне трэба асабліва накіраваць агонь на вялікадзяржаўны шовінізм і на яўрэйскую нацыяналабмежаванасьць сярод комсамольцаў.

Па сваёй колькасьці Камарынская организацыя невялікая—171 чалавек, якіх прынята за апошнія 6 месяцаў—60 чал. Ячэйкі налічваюць па 8-10 чалавек. Неабходна разгарнуць культурна-масавую работу, уцягнуць у комсамол усіх батракоў, лепшую колгасную моладзь. Пакуль што культурна-масавая работа у раёне абмяжоўваецца радыёмузыкай і тацулькамі, што нічога не дае для політычнага выхаваньня моладзі.

„ДЫ ТАК САБЕ... НІЧОГА..."

Партыйнае кіраўніцтва комсамола, як з боку РК КП(б)Б, так і з боку партячэек зусім слабае. Партыйная организацыя толькі ведае, што ў іх ёсьць комсамол, калі запытаешся: „А што ён робіць"?—дык атрымаеш — „Ды так сабе. — нічога", альбо: —„А што іх ведае" Партыйны асяродак складаецца ўсяго з 6 асоб. З боку комсамольцаў наглядаецца баязьнь уступленьня ў партыю: „Зараз нагружае комсамол, а потым яшчэ партыйная ячэйка".—Такія заявы можна чуць вельмі часта. Яны якраз сьведчаць аб вышэйсказаным, аб якасьці кіраўніцтва з боку партыйнай организацыі.

З сказанага відаць, што кіраўніцтва раёну з работай не справілася, яно ня стала на чале мас, не павяло масу з сабою.

Такое кіраўніцтва не можа быць пакінута на чале организацыі.

Брыгадзір „Ч. З." В. Войнаў.

Камарын.
Гомельшчына.

На абгаварэньне чытачоў

ЧАМУ Ў НЕКАТОРЫХ ЯЧЭЙКАХ ІСНУЮЦЬ МЁРТВЫЯ ДУШЫ

Чаму я не знаходжу выкарыстаньня сваіх сіл у комсамоле

„Кіраўніцтва нашай ячэйкі кідае нам гразь у твар, яно абвінавачвае нас ва ўступленьні ў саюз з-за карысных, шкурніцкіх мэтаў... Але гэта няпраўда! Я і яшчэ многія (бязумоўна ня ўсе, ёсьць і шкурнікі) уступілі для таго, каб не стаяць з боку, а прыняць непасрэдны ўдзел у вялікай соцыялістычнай будоўлі“.

Я ўступіў у комсамол у 1927 годзе. Думаў, што з жарам вазьмуся за работу. Але ўступіўшы пераканаўся ў сваёй памылцы. Працаваць аказалася мне не пад сілу. Я памыліўся ў мяркаваньні, калі спадзяваўся, што ўвальюся ў рады маладых энтузіястых, занятых жывой, захапліваючай карыснай работай і, уліўшыся ў гэты струмэнь буду ўцягнуты ім у работу, навучыўся працаваць. Але вялікае было маё расчараваньне, калі я ўбачыў работу ячэйкі, у якую ўступіў, а менавіта ячэйку Нарсувязі. (Менск). Конкрэтнай работы я там не знайшоў. Гаварылі, праўда, гаварылі многа, гаварыла, большасьць. Некаторыя маўчэлі. Я таксама маўчаў і прыслухоўваўся. Аднойчы паставілі маю індывідуальную справаздачу і грэлі за бязьдзейнасьць.

Я растлумачыў, што ня маю магчымасьці разабрацца сам у задачах што зараз стаяць перад саюзам, г. зн. уяўляю сабе гэтыя задачы але конкрэтна, як прыступіць да работы, як за яе ўзяцца, з чаго пачаць, я ня ведаў і гэта мяне мучыла. Няўжо-ж я такі дурны? Не, навука-ж мне даецца лёгка, да навукі здольнасьць я маю. Але чаго-ж мне ў такім выпадку не хапае? Чаму я не магу працаваць? І я прасіў кіраўніка ячэйкі дапамагчы мне, даць мне пункт прылажэньня сіл для патрэбнай карыснай работы. Але мне не паверылі, спасляліся на тое, што я маю сярэднюю адукацыю, а таму працаваць магу, але ня хочу.

І дапамогі я ніякай так і не атрымаў.

Што рабіць? Выйсьці з організацыі, каб ня лічыцца папяровым комсамольцам? — гэта ня выхад. І вось я рашыў напружыць усю сваю ўвагу і ўсе сілы, каб зразумець, растлумачыць, сабе у чым-жа заключаецца работа ячэйкі, намацаць, спазнаць мэту гэтай работы і ўключыцца ў яе, стаць зьвяном гэтага ланцугу, але пры ўсім напружаньні сілы я гэтай работы ўсё такі не знайшоў.

Работа-ж ня ў тых словаспрэчках, якімі займаецца большасьць нашых комсамольцаў. Работа таксама і не ў самаабслужваньні, да якога нажаль таксама беспасьпяхова імкнецца наша ячэйка. Работа заключаецца ў большым. Работа ў дапамозе партыі ў выкананьні намечаных ёю сур'ёзных задач, у якіх відаць конкрэтная карысная справа. А для таго, каб умець дапамагаць партыі ў гэтай сапраўды патрэбнай, карыснай рабоце, нам неабходна сур'ёзная вучоба. Вучоба-ж у нас звычайна адбываецца ў вывучэньні аджытага, мінулага: гісторыі партыі, вялікай Францускай рэволюцыі і г. д. Я, бязумоўна, ня хочу сказаць, што гэтага нам не патрэбна. Бязумоўна, неабходна і гэта. Але яшчэ больш неабходна нам вывучаць сучасныя, больш цікавячыя, хвалюючыя нас зараз пытаньні. Толькі тады мы зможам працаваць па сапраўднаму, тады будзем добра знаёмы з тым, якія задачы ставіць партыя ў даны момант і якія шляхі, якія пляны намячае для іх выкананьня.

Узяць-бы хоць пытаньне з колектывізацыяй, ды і большасьць пытаньняў, большасьць буйных падзей, мы пачынаем вывучаць толькі пасьля іх аканчэньня. Я думаю, што ня было-б у нас такіх памылак у колектывізацыі, калі-б комсамольцы, непасрэдныя праваднікі гэтай колектывізацыі, былі добра азнаёмлены з установкамі партыі ў гэтым пытаньні, з шляхамі якія партыя намеціла для правядзеньня гэтай работы. А мы з гэтымі ўстаноўкамі, з гэтымі шляхамі пачынаем дэталёва знаёміцца толькі цяпер, толькі ў сувязі з маючыміся памылкамі.

Некаторыя таварышы мне супярэчаць, гаворачы: з задачамі партыі і шляхамі выкананьня гэтых задач мы знаёмімся па газэтах. Гэтага мала. Мы яшчэ ня прывыклі кіравацца ў сваёй рабоце дырэктывамі, якія дае партыя праз друк.

Газэтны матар'ял мы часта забываем, а часам, так проста прапускаем што-небудзь самае важнае. Мая думка: неабходна больш увагі ў нашай вучобе зьвяртаць задачам бягучага моманту, а ўсякую гісторыю адсунуць на другі плян.

Кіраўніцтва нашай ячэйкі кідае нам гразь у твар, яно абвінавачвае нас ва ўступленьні ў саюз з-за карыстных, шкурніцкіх мэтаў... Але, гэта няпраўда! Я і яшчэ многія (бязумоўна ня ўсе, ёсьць і шкурнікі) уступалі для таго, каб не застацца з боку, а прыняць удзел у вялікай соцыялістычнай будоўлі.

Тыя-ж абставіны, што мы не знайшлі прыстасаваньня сваіх сіл і толькі дзякуючы гэтаму засталіся мёртвымі душамі,—гаворыць толькі аб тым, што кіраўніцтва некаторых організацый слабае. Яно здольна толькі вынасіць вымовы, абвінавачваць у шкурніцтве, а навучыць працаваць, уцягнуць у работу ня можа.

Шапашнікаў.

Ад рэдакцыі: Зьмяшчаючы ліст тав. Шапашнікава, рэдакцыя просіць чытачоў выказаць сваю думку на старонках газэты па закранатаму пытаньню, а таксама мы зварачваем увагу комсамольцаў і лічым неабходным абгаварыць гэты ліст на комсамольскіх ячэйках прыслаўшы свае прапановы і заўвагі ў рэдакцыю.

Віноўныя атрымалі па заслугах

ПЛЕШЧАНІЦЫ, 27. (Па тэлефону ад нашага юнвяскора). Скончыўся суд над працаўнікамі Плешчаніцкага райвыканкому, якія скрыўлялі клясавую лінію у часе колектывізацыі.

Падсудныя Якубовіч і Пятроўскі прыгавораны да 6 месяцаў прымусовых работ без пазбаўленьня ў правох. Падсудныя Маркевіч і Сьмірноў да 1-га году прымусовых работ без пазбаўленьня у правох. Падсудны Вашчонак, як судзімы у другі раз, прыгаворан да 2-х год зьняволеньня з пазбаўленьнем правоў.

Якубовіч і Пятровіч згодна амністыі да 10 годзьдзя вызваленьня Беларусі ад белапалякаў, ад прымусовых работ вызвалены і падсуднасьць з іх зьнята.

Г.

Аб прыёме ў Менскую Профтэхшколу будаўнікоў

Пачаўся прыём заяў для паступленьня ў Менскую Профтэхшколу будаўнікоў-дзесятнікаў. Заявы будуць прымацца да 10 жніўня, з 10 па 15 жніўня прыём, з 15 жніўня пачатак занятках.

Асьвету патрэбна мець за 7-годку. Узрост ад 14 да 18 год выключна. Школа рыхтуе высока-кваліфікаваных рабочых па будаўніцтву з тым, каб праз 2-хгадовы тэрмін вытворчага стажу яны знайшлі пасады адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсоналу, дзесятніка і інш.

Тэрмін навучаньня ў школе 2-х гадовы. У час вучобы палову ўсяго часу вучні працуюць на буйных набудовах г. Менску і атрымліваюць 75 проц. з заробку.

Заявы падаваць непасрэдна ў школу асабова ці па пошце і прыкладваць дакуманты: а) аб узросьце (мэтрыку), б) аб асьвеце (абавязкова орыгінал), в) аб здароўі, г) 2 фотографічныя карткі, д) аб соцыяльным і матар'яльным становішчы бацькоў пасьля рэволюцыі, е) аб праве голасу самога і бацькоў, ж) для сялян акладныя лісты, альбо копію яго па с-г. падатку за 1929-30 г. і з) завераную анкету.

Увага. Да заявы трэба дадаць паштовыя маркі на 20 кап. для адказу падаўцу заявы Адрас школы: Менск, Нова-Маскоўская 76-1.

Прыём у фізкультурны тэхнікум

З 1-га жніўня па 5-е верасьня г. г. адчыняецца прыём заяў ад асоб жадаючых паступіць у Менскі Дзяржаўны тэхнікум фізкультуры.

Тэрмін навучаньня 3-гадовы.

Жадаючыя паступіць павінны прадставіць усе дакуманты згодна даведніка НКАБ.

Акрамя таго паступаючыя праходзяць мэдагляд пры ўрачэбных габінэтах, здаюць іспыты па фізычнай падрыхтоўцы, атрымоўваюць анкеты і ўсе даведкі ў Акрсаветах фізкультуры.

Усе заявы накіроўваць па адрасу: Менск, Абонемэнт, паштовая скрынка № 65.

АДМІНІСТРАЦЫЯ.

У панядзелак, 28 ліпеня г. г., а 6 гадз. увечары ў памяшканьні ФРК адбудзецца

ПАСЕДЖАНЬНЕ КАНФЛІКТНАЙ КАМІСІІ

ФРК ЛКСМБ

Выклікаюцца ўсе таварышы, маючыя канфліктныя справы. Яўка сяброў КК—абавязкова.

ФРК ЛКСМБ

Пазыка „Пяцігодка—у чатыры гады“

Падпіскай на пазыку—узмацняць соцыялістычнае будаўніцтва краіны

Мэтадам спаборніцтва рэалізаваць пазыку

Працоўныя масы ўявілі сябе вялікае значэньне пасьпяховай рэалізацыі пазыкі, а таму на заводах, фабрыках і некаторых вясковых мясцовасьцях шырока разгарнулася гэтая праца.

На заводах і фабрыках **Беларусі** шмат рабочых падпісалася больш свайго тыднёвага заработку. Так, напрыклад, у **Мозыры** на папяровых вестках, работнікі дарожнага аддзелу падпісаліся на 2500 рублёў. **Жыткавіцкі** рабачком будаўнікоў сабраў падпіску на 1165 рублёў, **Нараўлянскі** рабачком будаўнікоў—на 750 рублёў.

Рабочыя **Мазырскай** пякарні падпісаліся на 1000 рублёў і выклікалі на спаборніцтва цукерную фабрыку **„Чырвоны Мазыранін“**.

Рабочыя півàварнага заводу падпісаліся на 100 проц. свайго заработку і выклікалі на соц. спаборніцтва **Мазырскі комбінат**.

Рабочыя **Менскай ф-кі „Кастрычнік“** падпісаліся на 78 тысяч рублёў, што складае больш 100 проц. іх двухтыднёвага заработку.

На заводзе **„Комунар“** рабочыя падпісаліся на 36000 рублёў.

Рабочыя заводу **„Энэргія“** падпісаліся на 22900 рублёў, што складае больш 50 проц. двухтыднёвага фонду зарплаты.

Рабочыя абутковай фабрыкі падпісаліся на 25000 рублёў, што складае 80 проц. двухтыднёвага заработку.

На **Бабруйскім** комбінаце на 25 ліпеня мы мелі 49 тысяч рублёў. Тут некаторыя цэхі падпісваюцца больш чым на 100 проц. свайго месячнага заработку. Комбінат заключыў соц. дагавор з швейнай фабрыкай імя Дзяржынск[ага] на лепшую падпіску. Партыйны[я] профэсыйныя організацыі комбі[ната] добра правялі растлумачальную [пра]цу па рэалізацыі пазыкі, а [за]працягваюць кіраваць гэтай спра[вай].

На **Гомельшчыне** на 23 лі[пеня] мы маем такую зводку:

Рабочыя **„Полесдруку“** па[дпі]саліся на 8200 рублёў.

Мэблевая фабрыка на 6[...] рублёў, завод **„Колектыўная [пра]ца“** на 6100 руб., Рабочыя га[...] заводу падпісаліся на 3555 ру[блёў].

Рабочыя заводу **„Чырвоны [ка]мік“** падпісаліся на 3290 ру[блёў].

Завод **„Соцыялізм“** на 4[...] рублёў.

Але ня ўсюды шырока разга[рну]лася праца па пасьпяховай р[эалі]зацыі пазыкі. Ёсьць шмат [прад]прыемстваў і організацый, [якія] яшчэ не разгарнулі, як нале[жыць] гэтую працу. Так на прадпр[ыем]ствах **Добруша, заводы „Пром[...]ры“ „Ланцуцкі“, „Чырвоны [Ка]стрычнік“, Саюз Комунальн[...] сэзоньнікі, саматужнікі і н[eка]торыя вясковыя раёны з[у]сім дрэнна праводзяць працу [па] рэалізацыі пазыкі.**

Неабходна зараз-жа адста[...] пры дапамозе „грамадзкага б[уксі]ру“, шляхам соц. спаборніцтва [ўцягнуцца] і выправіць гэты [ад]стак працы.

Масавай падпіскай на пазык[у] скорым тэмпы соцыялістычнай будовы краіны Саветаў!

Пасьпяховай рэалізацыяй па[зыкі] дапаможам партыі выканаць [Пяці]годку ў чатыры гады.

Комсамол у гэтай справе не [па]вінен плясьціся ў хвасьце.

Ц.

Да чарговага тыражу III пазыкі індустрыялізацыі ў Менску

З гутаркі з Старшынёй Тыражнай Камісіі т. Хацкевічам

3-ці тыраж III пазыкі індустрыялізацыі, які адбудзецца ў пэрыяд разгортваньня кампаніі па рэалізацыі пазыкі „Пяцігодка ў чатыры гады“, набывае вялікае політычнае значэньне.

Тыраж гэты павінен быць поўнасьцю выкарыстаны для растлумачэньня працоўным гораду і вёскі вялікай ролі пазык у справе індустрыялізацыі нашай краіны, разьвіцьця прамысловасьці, соцыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі, а таксама для растлумачэньня ролі і сутнасьці тэмпаў нашага пераможнага соцыялістычнага будаўніцтва. Гэтым самым мы дапаможам ажыцьцяўленьню пастаўленых XVI зьездам нашай партыі велізарных задач, гэтым мы дапаможам пасьпяховасьці кампаніі па рэалізацыі пазыкі „Пяцігодка—у 4 гады“.

Мы павінны даць самы рашучы адпор агітацыі варожых элемэнтаў супроць пазык пролетарскай дзяржавы і новай рэформы дзяржкрэдыту.

Кампанія па рэалізацыі пазыкі „Пяцігодка у 4 гады“, у якой павінны прыняць удзел усе партыйныя, савецкія, грамадзкія ўстановы і організацыі, — павінна ператварыцца ў вялікую політычную кампанію за выкананьне ў чатыры гады ўсяго пяцігадовага пляну вялікіх работ, за выкананьне новых велізарных задач, будаўніцтва соцыялізму ў нашай краіне.

На тыражу, які адбудзецца ў першых лічбах жніўня, працоўныя павінны ня толькі ўбачыць як дзяржава выконвае свае фінанс[авыя] абавязацельствы, але павінны сама ведаць што дзяржава па[...] вае атрымаўшыя па пазыках с[...] на разьвіцьцё нашай гаспадар[кі] мэтай дагнаць і перагнаць пе[рада]выя капіталістычныя краіны.

Працоўныя масы насельніцт[ва] павінны ведаць, што з дзяржа[ўнага] бюджэту Савецкага Саюзу 1929[...] у 11,5 міліарда рублёў (апроч [па]датковых асыгнаваньняў)—7,5 [мі]ліарда рублёў накіроўваецца на фінансаваньне народнае гаспадар[кі] якіх: [...] міліярдаў рублёў ідзе на новыя ўкладаньні у народную гаспадарку; яны павінны таксама ведаць, што амаль 12 проц. Саюзнага бюджэту дзяржава мобілізуе ад ўнутраных пазык.

Зразуменьне ўсімі працоў[нымі] політычнай і экономічнай сут[насьці] мерапрыемстваў савецкай ул[ады] забясьпечыць выкананьне і [пера]выкананьне контрольных [за]даньняў па новай пазыцы.

Гэта мерае будзе і павінен [...] дзейнічаць III тыраж III [пазыкі] індустрыялізацыі.

Задачай нашага друку зьяўл[яецца] популярызацыя пазыкі, а та[ксама] асьвятленьне работы па тыр[ажу]. Усе рабочыя, служачыя, ко[лгас]нікі, бедняцка-серадняцкія ма[сы і] іншыя працоўныя нашай кр[аіны] павінны падпісацца на п[азыку] „Пяцігодка ў чатыры гады“ і [за]бясьпечыць поўную рэалізац[ыю] гэтай па ыкі.

Мы запрашаем працоўных [гораду] і вёскі на тыраж, які адб[удзецца] 1—3-га жніўня у Менску.

Адказны рэдактар—Рэдколегія

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599